# НА СУБОТНІК — ПРАЗ ЗАКЛІК ВА «УКАНТАКЦЕ»

НОВЫЯ ІМЁНЫ

**Што паспеў зрабіць за сто дзён малады старшыня сельскага выканкама**

**Мікалай ЛУГАЎСКОЙ прыйшоў у Ленінскі сельскі Савет Жабінкаўскага раёна з пасады другога сакратара абкама БРСМ сёлета ў ліпені. Як і варта было чакаць, за справу ўзяўся з маладым запалам. І за тры месяцы работы паспеў рэалізаваць некалькі ўласных ініцыятыў.**



Старшыня сельскага Савета Мікалай ЛУГАЎСКОЙ падчас пасадкі алеі.

## ДОШКА ПАШАНЫ І НОВЫ СКВЕР

Каля ўвахода ў сельскі Савет маю ўвагу прыцягнула Дошка пашаны. Такія даводзілася бачыць у вёсках, але на іх заўсёды красаваліся здымкі перадавікоў сельгаспрадпрыемства. А тут побач з работнікамі і спецыялістамі сельскага ААТ размешчаны партрэты настаўніка, фельчара, прадпрымальніка, бібліятэкара. На Дошку пашаны Ленінскага сельсавета занесены імёны найлепшых працаўнікоў прадпрыемстваў, устаноў розных формаў гаспадарання, якія ёсць на тэрыторыі. Як паказваюць першыя водгукі, людзі ацанілі такую ўвагу.

Вядома, самай галоўнай справай мясцовай улады заўсёды было добраўпарадкаванне. Восеньскія клопаты па навядзенні парадку сёлета пачалі з закладкі новага сквера, а калі пасадзілі маленькія дрэўцы і абазначылі будучае месца адпачынку, вырашылі работу па азеляненні працягнуць. Лясгас выдзеліў саджанцы елкі: 179 маленькіх дрэўцаў пасадзілі ўздоўж дарогі (пасёлак стаіць на трасе М1).

— Паглядзелі з іншых вуліц, а таксама жыхары Рагозна, Філіпавіч, Буснёў на добрую справу, захацелі ў сябе пасадзіць дрэўцы, — расказвае Мікалай Лугаўской. — Сельсавет іх падтрымаў. Людзі выйшлі на суботнікі, папрацавалі грамадой, разам будуць і даглядаць маладыя елачкі.

І калі з гэтай работай жыхары справіліся самі, то з іншымі аб'ектамі, якія патрабуюць добраўпарадкавання, сітуацыя больш складаная. Напрыклад, у старадаўнім парку, што ўяўляе сабой рэшткі былой панскай сядзібы, таксама правялі суботнік. Прыбралі сухія галіны, апалае лісце. Але там патрэбны грошы, каб, напрыклад, змыць мыць пачысціць былыя сажалкі, пракласці дарожкі, пасадзіць новыя дрэвы. Кіраўніку мясцовай улады падказалі, што можна падрыхтаваць дакументы і прыняць удзел у конкурсе ініцыятыў, вынік якога — атрыманне гранта на добрую справу. Так што цяпер рыхтуецца апісанне будучай экалагічнай сцяжыны.

## ПАРАДАК КАЛЯ ПОМНІКАЎ

Грунтоўная работа ў апошнія месяцы праведзеная па рамонце і добраўпарадкаванні тэрыторыі вакол капліцы ў гонар Крупчыцкай бітвы. Самая вялікая і крывавая бітва падчас касцюшкаўскага паўстання адбылася ў верасні 1794 года пад Крупчыцамі, цяпер гэта вёска Чыжэўшчына. На гэтым месцы стаіць капліца, якую трэба перыядычна даглядаць і абнаўляць. Таму старшыня мясцовай улады не абмежаваўся адным суботнікам. Былі арганізаваны сапраўдны працоўны дэсант. Спачатку падправілі фундамент, пафарбавалі агароджу, прыбралі шмат непатрэбных раслін. Карацей, надалі тэрыторыі прывабны выгляд. Таксама дагледзелі помнік ахвярам Халакосту, які ўстаноўлены ў вёсцы Хадасы.

— Утрымліваць помнікі дастойна на сваёй тэрыторыі заўсёды лічылася справай гонару нашчадкаў, — кажа старшыня сельскага Савета.

**Анатоль ШАЛТАНЮК, старшыня Жабінкаўскага раённага Савета дэпутатаў:**

— Ленінскі сельсавет асаблівы. Яго цэнтр — аграгарадок Ленінскі — і навакольныя вёскі размешчаны ў бойкім месцы, паабапал трасы М1. Тут вельмі зручна дабірацца да Брэста, Кобрына. Некаторыя і працуюць у гэтых гарадах. Дзве траціны насельніцтва Ленінскага складаюць людзі да 40 гадоў. У пасёлку і навакольных вёсках няма ніводнага вольнага ўчастка пад забудову, яны тут жа разбіраюцца. Тут не засталося і свабоднага гектара зямлі, бо развіты падсобныя гаспадаркі, ёсць фермеры. Аграгарадок мае добрую інфраструктуру, свае традыцыі, захавальнікамі якіх з'яўляюцца школа і культурныя ўстановы. У гэтых умовах падтрымліваць парадак надзвычай актуальна. Лічу, што новы кіраўнік сельвыканкама нездарма зрабіў упор на згуртаванне людзей вакол добрых спраў і выкарыстоўвае для гэтага ў тым ліку інфармацыйныя тэхналогіі. А для тых, хто з інтэрнэтам не вельмі сябруе, каля сельскага Савета з'явіўся новы інфармацыйны стэнд.

## СТАНОЎЧЫ ПРЫКЛАД

Мікалай Лугаўской мае намер акцэнтаваць увагу на станоўчым прыкладзе, усяляк падтрымліваць вопыт жыхароў, якія ствараюць прыгажосць вакол сябе. Так з'явілася рашэнне праводзіць конкурс на найлепшы падворак не раз, а два разы на год: вясной і восенню. Сёлета такі конкурс праводзілі ў жніўні. На ім у ліку іншых быў адзначаны Міхаіл Хандрыка, які працуе культарганізатарам у санаторыі «Надзея». Гаспадар і яго жонка добраўпарадкавалі спачатку ўласны падворак, затым навялі прыгажосць на вуліцы побач з домам: пасеялі газонную траву, разбілі клумбы, зрабілі падсветку. І цяпер іх сядзіба — адна з найпрыгажэйшых у Ленінскім.

А зрабіць свята вёскі святам для ўсіх можна, калі згуртаваць аднадумцаў, знайсці падтрымку ў грамады — да такой высновы прыйшоў старшыня падчас першага ў сваёй практыцы вясковага свята. І калі знайсці грошы на прэміі пераможцам конкурсаў аказалася няпроста, то арганізаваць заахвочвальныя прызы ўдалося. Мясцовая прадпрымальніца-цырульнік ахвяравала некалькі сертыфікатаў для наведвання сваёй майстэрні, прадпрымальнікі-аграрыі ўзнагародзілі ўласнай прадукцыяй.

Кіраўнік ААТ «Рагазнянскае» Аляксандр Семянюк кажа, што заўсёды гатовы падтрымаць разумную ініцыятыву. Так было, дарэчы, і з Дошкай пашаны, выраб якой прафінансавала гаспадарка. Ну і ў справе добраўпарадкавання сельгаспрадпрыемства ніколі не застаецца ўбаку. Тут жа жыве значная частка працаўнікоў і ветэранаў гаспадаркі. Папрасіў аднойчы выканкам прывезці чарназёму для ўладкавання двара побач з адным з самых старых шматкватэрных дамоў. Грунт падвезлі машынай гаспадаркі. Людзі выйшлі на вуліцу дружна, зямлю разраўнялі, пасадзілі туі, кветкі. У ЖКГ убачылі, што ў доме жывуць руплівыя гаспадары, і праклалі каля дома новыя дарожкі. Пайшла ланцуговая рэакцыя добрых спраў.

Да наступнага свята вёскі рыхтуецца мноства іншых спраў і пачынанняў. Напрыклад, каваль Аляксандр Кузнец у якасці падарунка Ленінскаму ўзяўся выкаваць ажурны слуп з указальнікам населеных пунктаў і сацыяльна-значных аб'ектаў. Ёсць іншыя падобныя задумкі.

Таму Мікалай Лугаўской актыўна прысутнічае ў сацыяльных сетках, ёсць сельсавецкія групы ва «УКантакце», «Фэйсбуку» і «Твітэры». На любую добрую справу людзей можна арганізаваць, папярэдне кінуўшы заклік. У найбліжэйшыя дні старшыня плануе звярнуцца да землякоў з прапановай арганізавацца ў пасёлку навагоднюю елку. Раней тут святочны атрыбут ніколі не ставілі, а пасля дванаццаці ў навагоднюю ноч людзі збіраліся каля Дома культуры на вясковае народнае гулянне. Але ж без сімвалічнага дрэўца, згадзіцеся, не той каларыт Новага года. Выправіць справу можна талакой: ад кожнай сям'і дастаткова прынесці па два шары і ўпакоўку мішуры. Прадпрымальнікі згадзіліся дапамагчы электрычнымі гірляндамі. Калі людзі ідэю падтрымаюць, гэтым разам будзе прыгожая навагодняя елка ў Ленінскім.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

*Жабінкаўскі раён.*

# ДОСВЕД У НЮАНСАХ

**Якім чынам ствараць новыя працоўныя месцы на вёсцы? Як арганізаваць работу па добраўпарадкаванні і навядзенні парадку на зямлі? За якія сродкі выдаляюцца дрэвы на вясковых могілках? Гэтыя і іншыя праблемныя пытанні абмяркоўваліся ў Ельскім раёне падчас абласнога семінара са старшынямі раённых Саветаў дэпутатаў Гомельшчыны.**

Выязная сустрэча дэпутатаў і кіраўнікоў абласных арганізацый далёка не першая, таму дыялог ідзе актыўны. Дасягненні і недахопы ў пэўных сельскіх населеных пунктах бачны адразу. У Млыноцкім сельсавеце, напрыклад, завязалася вострая дыскусія, звязаная з арганізацыяй парадку на могілках. Ёсць пытанні з пляцоўкамі для смецця і пахаваннямі нябожчыкаў, людзі ажыццяўляюць пахаванні ў магілы сваіх продкаў без дазволу сельсавета. **Алена КОЗІНЦАВА, старшыня сельвыканкама,** адзначае, што сёлета жук-караед дабраўся да могілак — хвоі адразу сталі жоўтыя. А гэта значыць, што векавыя дрэвы, якія там растуць, патрабуюць тэрміновага выдалення.

Праблемы, звязаныя з гэтым працэсам, добра вядомыя ўсім старшыням раённых Саветаў і сельвыканкамаў. Для правядзення работ запрашаюць спецыялістаў МНС і камунальныя службы з адпаведнай тэхнікай. Але ж вялізныя машыны часцей за ўсё працуюць па перыметры. Усярэдзіне патрабуецца амаль ювелірная работа, каб пры падзенні галін не пашкодзіць помнікі. У Млыноцкім сельсавеце са сваіх жыхароў знайшлі мужчыну, які згадзіўся атрымаць новую кваліфікацыю і адправіцца яго вучыцца на прамысловага альпініста. Цяпер ён займаецца карпатлівай работай па выдаленні старых дрэў, у тым ліку на могілках.

«За якія сродкі выдаляюцца дрэвы?» Гэтае пытанне дэпутаты задаюць адзін аднаму і тут жа дзеляцца досведам. За сродкі на добраўпарадкаванне і так званае самаабкладанне. Раённымі ўладамі выдзяляюцца грошы на добраўпарадкаванне воінскіх пахаванняў і помнікаў, якія маюць статус гісторыка-культурнай спадчыны. У Ельскім раёне, напрыклад, налета два сельскія Саветы паўдзельнічаюць у праграме па рэстаўрацыі воінскіх пахаванняў. Таксама тут актыўна працуюць з мясцовым упраўленнем па працы, занятасці і сацыяльнай абароне. Беспрацоўных людзей з адпаведнай кваліфікацыяй актыўна прыцягваюць да работ на могілках.

— Першачарговая задача дэпутатаў і старшыняў камісій па садзейнічанні занятасці, — кажа **старшыня Гомельскага абласнога Савета дэпутатаў Кацярына ЗЕНКЕВІЧ,** — данесці ў даступнай форме гэтую інфармацыю да кожнага жыхара свайго рэгіёна. Дарэчы, мы прапануем да фарміравання плана на наступны год, у якім працягнем абмен інавацыйным досведам па розных кірунках нашай дзейнасці.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

